# УЛІК УЗРОСТАВЫХ АСАБЛІВАСЦЕЙ ПАДЛЕТКАЎ У ЭТНАКУЛЬТУРНЫМ ВЫХАВАННІ

**Канцэвіч І. У.**
*аспірантка кафедры сацыякультурнай дзейнасці*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Этнакультурнае выхаванне падрастаючага пакалення ў сучаснай Беларусі становіцца адным з асноўных напрамкаў выхавання ў аматарскіх мастацкіх калектывах. Педагогі і мастацкія кіраўнікі ў выхаванні сваіх вучняў абапіраюцца на народную спадчыну, якая змяшчае каштоўнасныя ідэі выхавання.

Этнакультурнае выхаванне падрастаючага пакалення вызначаецца сацыяльнымі і духоўнымі зменамі. Змяніліся метадалагічныя падыходы да дадзенай праблемы, вядуцца пошукі механізмаў выхавання любві да роднага краю, вызначаецца іх месца ў эмацыянальнай, інтэлектуальнай і маральнай структуры асобы.

У сучаснага дзіцяці, які жыхарыць ва ўмовах горада, слаба выяўленае адчуванне прыналежнасці да беларускага народу, і таму адна з задач педагогаў і кіраўнікоў аматарскіх аб’яднанняў і гурткоў – стварыць умовы для ўсеагульнага развіцця асобы дзіцяці з улікам узроставых асаблівасцей праз гарманічную пабудову цэласнага педагагічнага працэса, заснаванага на этнакультурных каштоўнасцях роднага краю.

Актыўна працэс этнакультурнага выхавання адбываецца ва ўстановах культуры і адукацыі, у прыватнасці ў аматарскіх мастацкіх калектывах, грамадскіх аб’яднаннях і гуртках, удзельнікамі якіх з’яўляюцца дзеці рознага ўзросту. Вялікую ўвагу трэба звярнуць на дзяцей падлеткавага ўзросту, таму што гэта самы складаны перыяд выхавання і станаўлення асобы.

Этнакультурнае выхаванне падлеткаў можна вызначыць як цэласны працэс далучэння дзіцяці да розных відаў народнага мастацтва, а таксама здзяйснення, забеспячэння і арганізацыі разнастайнай творчай дзейнасці.

Мы разглядаем падлетка як суб’екта этнаса і актыўнага носьбіта культуры свайго народа. Падлеткавы ўзрост з’яўляецца найбольш сензітыўным, спрыяльным для этнакультурнага выхавання, важных маральных і эстэтычных якасцей, нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей. Гэта перыяд павялічанай адчувальнасці для ўспрыняцця агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей, усведамленне сваей ролі як носьбіта нацыянальных каштоўнасцей, фарміраванне актыўнай жыццевай пазіцыі.

У працэсе развіцця асобы падлеткаў пачынаюць актыўна фарміравацца сама-ідэнтычнасць, этнічная ідэнтычнасць, адбываецца станаўленне асобы, адкрыццё асабістага «Я». Паводле Э. Эрыксана, менавіта на гэтай стадыі развіцця становіцца магчымым разважанні аб самім сабе, адбываецца ідэнтыфікацыя асобы. Працэс этнічнага станаўлення асобы падлетка праходзіць на фоне зменаў, якія адбываюцца ў гэты перыяд. Вельмі шмат часу падлетак надае сваей асобе, параўноўваючы сабе с бацькамі, сябрамі і знаёмымі. Ен звяртае сваю ўвагу не толькі на знешні выгляд, асаблівасці характару, а і на прыналежнасць да таго ці іншага этнасу. Этнічная ідэнтычнасць вызначае і адлюстроўвае прыналежнасць асобы да той ці іншай этнічнай групы, а таксама вызначае і пазітыўныя каштоўнасныя адносіны да гісторыі, культуры, нацыянальных традыцый і звычаяў свайго народа, да яго ідэалаў, пачуццяў, інтарэсаў, фальклору і мовы.

Ідэнтычнасць асобы ў працэсе свайго станаўлення праходзіць некалькі этапаў, якія можна суаднесці з этапамі псіхічнага развіцця дзіцяці. Адным з першых такую канцэпцыю прапанаваў Ж. Піажэ, які выдзеліў тры этапы ў фарміраванні этнічнай ідэнтычнасці:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. у 6–7 гадоў дзіця набывае першыя фрагментарныя несістэмныя веды аб этнічнай прыналежнасці. У гэтым узросце найбольш значнымі з'яўляюцца сям'я і непасрэдны соцыум, а не краіна і этнічная група;

2. у 8–9 гадоў дзіця ўжо дакладна ідэнтыфікуе сябе са сваёй этнічнай групай, выдзяляючы асновы ідэнтыфікацыі – мову, месца пражывання;

3. у малодшым падлеткавым узросце (10–11 гадоў) этнічная ідэнтычнасць фарміруецца ў поўным аб'еме, у якасці асаблівасцей розных народаў дзіця адзначае ўнікальнасць гісторыі, спецыфіку традыцыйнай бытавой культуры [3, с. 218].

Абапіраючыся на даследаванні Э. Эрыксана і Ж. Піажэ мы хацелі б звярнуць ўвагу мастацкіх кіраўнікоў на тое, што пры арганізацыі працэса этнакультурнага выхавання абавязкова трэба ўлічваць узроставыя асаблівасці дзіцяці і ў залежнасці ад гэтага выкарыстоўваць пэўныя выхаваўча-педагагічныя метады, а таксама ствараць такія ўмовы выхавання, пры якіх фарміраванне асобы будзе найбольш паспяховым.

Большая частка мастацкіх кіраўнікоў, не маючы распрацаванай методыкі па этнакультурнаму выхаванню ў аматарскіх мастацкіх калектывах, гуртках і аб'яднаннях, арганізуюць гэты працэс пры дапамозе разнастайных відаў творчай дзейнасці, да якой адносяцца спевы (сольныя ці харавыя), танец, народныя святы, народны тэатр і інш. Для падлеткаў-удзельнікаў аматарскага мастацкага калектыва адзін з напрамкаў этнакультурнага выхавання можа быць звязаны з зразуменнем традыцыйнай музычнай творчасці, народных музычных традыцый, фальклора. Традыцыйная народна-спеўная культура выяўляе арганічнае ўзаемадзеянне чалавека з навакольным светам і іншымі людзьмі, якія здзяйсняюцца на выпрацаваных шматлікімі пакаленнямі духоўна-маральных асновах. Народная музычная культура, якая забяспечвае пераемнасць гістарычнага досведу народа здольна аб'яднаць прадстаўнікоў свайго этнасу, узнавіць маральныя і этнічныя асновы нацыянальнага характару, што служыць этнаінтэгрыруючым фактарам і асновай у этнакультурным выхаванні падрастаючага пакалення.

У вырашэнні задач этнакультурнага выхавання вельмі вартым з'яўляецца фарміраванне ў падлеткаў каштоўнасных адносін да агульнай культуры асобы, а таксама непарыўнасці працэсаў інкультурацыі і сацыялізацыі, паколькі індывідуальная культура асобы складае індывідуальную аснову культуры этнаса, нацыі, сацыяльнай групы.

Фарміраванне шматлікіх этнічных рыс чалавека неапасрэдна залежыць ад ступені засваення ім культуры свайго этнаса, у якой галоўным для яго выступаюць каштоўнасці і нормы жыцця, дзейнасці і паводзін.

***Літаратура***

1. Арлова, Г. П. Традыцыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы: манаграфія / Г. П. Арлова, С. Р. Туболец; пад агульн. Рэд. Г. П. Арловай. – Віцебск: ВДУ імя Машэрава, 2008. – 162 с.

2. Гамезо, М. В. Возрастная и педагогическая психология / М. В. Гамезо, Е. А. Петрова, Л. М. Орлова. – М.: Пед. Общество России, 2009. – 512 с.

3. Пиаже, Ж. Речь и мышление ребенка / Ж. Пиаже. – М.: Педагогика-Пресс, 1994. – 526 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ